Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

№ 23 (52) Пятніца, 15-га ліпня 1927 г. м. Вільня. Год II.

Беларускае слова

Выходзіць раз у тыдзень Цана нумару 20 грош.

Нацыянальнае а[illegible] —Тэрыторыяльная і культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі дэмократ[illegible] Бара[illegible]унізмам.—Нацыянальная царква.—Краевая згода.—Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Падпісна[illegible] на месяц [illegible]
„ Загр[illegible]жэй.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno ul. Zawalna 6 m. 4
Рэдакцыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: На 1 старане —20 гр.
„ У тэксце „ —40 гр.
„ На 4 старане —15 гр.
За кожны мілім. шырыны ў 1 шпальту.
Старана мае 8 шпальтаў.

ВІЛЕНСКАЕ БЕЗЛЮДЗЬДЗЕ.

Ніжэй мы падаём сапастаўленьня двух комунікатаў: Віленскага Бел. Нац. Камітэту № 1 і Віленскага Бел. Нац. Камітэту № 2.

Гэтае сапаўстаўленьне гаворыць само за сябе!

Толькі нядаўна мы падавалі у сваей газэце вестку аб тым, што ў Вільні побач Рагульярэміцкага „Сель-Саюзу“, паўстаў новы „Сель-Саюз“ на чале з Я. Станкевічам. Гэтыя два саюзы не прызнаюць адзін другога. Кожны з іх лічыць правідловым, *настаяшчым* толькі сябе і на чым сьвет стаіць ганьбіць свайго праціўніка. Цяпер мы маем *два* віленскіх „нацыянальных“ камітэты.

Чаму гэта так? Што за прычына?

Прычына тая, што віленская палітычна-партыйная атмасфэра аканчальна атручана. Антон Луцкевіч нарэшце дабяў свайго беларусы ўсе набіліся паміж сабою на драбнейшыя групкі, нават ужо не па прынцыпу партыйнаму, ці пэўнай ідэалёгіі, а проста з прычыны пэрсональнага непаразуменьня і нязгоды, а галоўнае за верхаводзтва і пасады.

Другая галоўная прычына гэта—тая, што віленскія лідэры адыйшлі ад народнай і сялянскай тоўшчы. Ім усім здаецца, што яны нібыто добра ведаюць народ. Яны з вялікім самадумствам і пыхай кідаюцца фразамі аб „абароне працоўных“, аб „змаганьні за сялянства“ і г. д., але і яны ня прымечаюць, што яны самі страшэнна далёкія ад самага жыцьця, патрэбаў, нарэшце думак і імкненьняў *Беларускай Вёскі*. Праўда Грамада нядаўна мела ў сваіх радох 100 тысячаў сябраў. Так, гэта праўда, але дзе гэтыя 100 тысячаў сяньня, калі правадыры у турме? Сяньня з гэтых 100 тысячаў павінна было-бы быць у тры, чатыры разы больш, бо правадыры страдаюць у турме за справу сваей Грамады. Гэтага няма! Грамада расыпалася, як картачны дамок, бо правадыры яе блудзілі, а галоўнае—рэвалюцыйная ідэя Грамады была незразумелай, непатрэбнай Народу. Мы ня хочам сказаць, што беларускаму Народу не зразумелыя рэвалюцыйныя імкненьня..

Яны зразумелыя і актамі гісторычнымі, як 25-ае сакавіка 1918 году і слаўнае слуцкае паўстаньня, Беларускі Народ даказаў што ён жадае Свабоды і Вольнасьці!..

Але ісьці на рэвалюцыю, на якую клікала яго Грамада, каб зьмяніць сяньняшняга польскага паліцыянта на маскоўскага чэкіста Народ ня згодзіўся і гэтай рэвалюцыі не прыняў.

Маладыя, гарачыя, чубатыя голавы праўда пробавалі дзействоваць і нават даволі актыўна, але скора і іх пыл астыгнуў...

І хоць гэта можа звучэць як парадокс, але гэта ёсьць праўда: Народ не зразумеў Грамады і ня ўвітаўся ў яе, ня зросься з ею. Абмылілася і Грамада з сваімі камуністычнымі закардоннымі кіраўнікамі ў стаўцы сваёй на беларускую сялянскую цемнату і на актыўнасьць масаў ад раздражэньня і незадаваленьня крэсовымі абставінамі жыцьця. Ня ўрасла Грамада у вёску беларускую, а яшчэ больш далёкім ад беларускай вёскі аказаўся віленскі Белком, цалком апанаваны грамадаўцамі з сваім старшынёю марыавэткай — Савіцкім і фактычным сваім кіраўніком, многалікім тварам міжнароднага прайдохі

Тым балей ўзрасла патрэбнасьць для радыкальных беларускіх віленскіх групаў мець свой нацыянальны камітэт у Вільні. Гэта патрэба павялічвалася поўным упадкам усякага аўтарытэту і адсутнасьцю ўсялякай дзейнасьці з боку „беларускага пасольскага клюбу“ на чале з Ярэмічам.!

Падышоў час, калі пара ўжо думаць і аб надыходзячых выбарах да Сойму і Сэнату. І вось утвораны новы Белком! Але з каго? Можа пацягнуты новыя, сьвежыя сілы з черназёмна здаровай і магутнай беларускай вёскі, як гэта было, калі тварылася новая Беларуская Нацыянальная Партыя?

Дзе там! Новы Бел. Нац. Камітэт, які будзе (зразумела!) прэтэндаваць на „усебеларускасьць“ на „цэнтральнасьць“ і „манаполію“, рабіўся з тых-жа палінялых, яшчэ так нядаўна скандальва праваліўшыхся на магістрацкіх выбарах: Ярэміча, Більдзюкевіча і г. д. з неабходнай дамешкай беларускіх хадэкаў (статыстаў, а не фактычных дзеячоў хадэцкіх!)

Але самае пікантнае здарылася падчас выбараў новага старшыні камітэту!... Тут лідэры — банкруты гэтак перасварыліся паміж сабою за пяршэнства, што выбралі на старшы *беларускага нацыянальнага* камітэту... — лідэра віленскіх расейцаў!

Мы нічога не маем проціў *асобы* агульна паважанага сэнатара п. Багдановіча. Але мы ня можам устрымаць свайго зьдзіўленьня і абурэньня, калі на чале беларускага нацыянальнага камітэту выбіраецца беларусамі выбарчы лідэр тых расейскіх партыяў і арганізацыяў, кіраўнічую ролю у якіх адыгрывае арганізацыі шовініста зьменавехаўца Сярэбранікава г. зв. „Русское Народное Об‘единеніе“, якое перад усей Эўропай на сваім Львоўскім з'езьдзе ня прызнало нават самага існаваньня Беларускай Нацыі, а лідэр Навагрудчыны гэтага „Об‘единенія“ абшарнік Моллер не „*знайшоў*“ на Навагрудчыне ніводнага беларуса — сяляніна, апрача „русскіх“.

Праўда сэнатар Багдановіч прайшоў у сэнат як беларус і беларускімі галасамі, але гэта было ў 1922 годзе... А сяньня, ў 1927 годзе ён прайшоў у Віленскі магістрат як лідэр расейцаў і расейскімі галасамі!.. Аб гэтым ведама ўсім граматным людзям, аб гэтым адкрыта пісалі ўсе расейскія газэты як віленскія, так і варшаўскія, падаючы выбраньне, п. Багдановіча як перамогу расейцаў у выбарчай акцыі.

Сяньня п. Багдановіч—старшыня Беларускага Нац. Камітэту! Скандал і прафанацыя Беларускай Нацыі ўб сталіцы Беларусі!

Мы адвосіліся негатыўна да папярэдняга Грамадоўскага „Белкому“, які сеяў комуністычную заразу і дэмаралізаваў нашую моладзь, і мы з ім змагаліся, будзем змагацца і далей. Нехай яго сяньняшні старшыня Савіцкі пешка, але ён беларус, настаўнік беларускай віленскай гімназіі. Нехай Луцкевіч фактычны кіраўнік Белкому, № 1 ёсьць прайдзісьвет, шкадлівую дзейнасьць каторага асудзілі ўсе сучасныя беларускія групы і партыі, і якога будзе судзіць Беларускі Народ і гісторыя але скажам зусім шчыра: ў параўнаньні кандыдатуры Луцкевіча і лідэра расейцаў на мейсца старшыні Беларускагага Нацыянальнага Камітэту — выйгрывае без конкурэнцыі Луцкевіч.

Утварэньне двух віленскіх „*селянскіх*“ саюзаў з кучкі гарадзкіх інтэлігэнтаў (без фактычных сялян!), паўстаньня двух віленскіх „*нацыянальных*“ камітэтаў, з якіх адзін апанаваны інтэрнацыянальна — грамадаўскім элемэнтам, а на чале другога стаў лідэр расейцаў, гэтыя факты іскрава сьведчаць аб поўным бязлюдзьдзі сярод радыкальна-сацыялістычных беларускіх групаў.

Гэта ў той час, як Беларуская Вёска прабудзілася, калі з тоўшчы Зямлі Беларускай падымаюцца новыя, сьвежыя, народныя сілы!.

Але „лідэры“, трасучыся за свае цёплыя пасады, мейсца і становішча, зайздросна ня пускаюць вясковых конкурэнтаў. Аднак-жа два вышэйпаданыя прыкрыя факты ў беларускім палітычным жыцьці мы зусім ня думаем браць вельмі драматычна. Мы проста канстатуем поўны банкрот беларускіх сацыялістычна - радыкальных груціровак, якія ў момэнт, калі падыходзяць вялікія падзеі, калі рушыцца бальшавіцкая ўлада ў С.С.Р.Р. і паўстае пытаньня аб новым укладзе палітычных сілаў на Усходзе, ў сваім нічтожастве ня могуць выйсьці па за рамкі сваей дробнамяшчанскай грызьні, партыйніцтва і барацьбы за цёплыя, хаця нават недаўгавечныя і няпэўныя становішчы А констатуючы гэта банкроцтва і нічтожаства, ня можам не падкрэсьліць *асаблівасьці* значэньня тых арганізацыяў, якія шырока расчынілі віленскія рамкі... Тых арг., якія пад сваім нацыянальным штандарам лучаць места і вёску, інтэлігэнцыю і сялянскую масу. Тых арганізацыяў, якія нарэшце ў толькі што адбыўшыхся выбарох да валасных самаўрадаў лучнасьць гэтую паказалі на дзеле, даўшы нават валасным радам 80% беларусаў.

Гэтая лучнасьць, еднасьць і актыўная праца беларускага сяялнства з мястовай і вясковай беларускай інтэлігэнцыяй пад адзіным нацыянальным сьцягам дасьць Беларускаму Народу не адну яшчэ перамогу на Яго вызваленчым шляху.

Ад Цэнтр. Выб. К-ту

Першыя беларускія войты.

5 ліпня адбыліся выбары да Ураду гміны Сіняўскай На войта застаў выбраны Ант. Мілешкевіч — ІНСТРУКТАР БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА ВЫБАРНАГА КАМІТЭТУ.

У Клецку на кандыдатуру войта беларусы адмовіліся з прычыны кепскага ўладаньня польскай мовай і Новая Рада перавыбрала старага войта гр. Барахоўскага, якім гміна да гэтага часу была задаволяна. На тое мейсца заступнікам войта выбраным аказаўся гр. п. А. Мікарэй — інструктор Бел. Нац. Выб. Камітэту. Апрача яго лаўнікам выбраны з бел. нац. сьпіску П. Масейчык.

Першым беларускім самаўрадавым працоўніком жадаем у іхняй цяжкай і адказнай працы ад шчырага сэрца: дапамажы Божа!

БЕЛ. НАЦ. ВЫБ. КАМІТЭТ
у ВІЛЬНІ.

5 ліпня адбыліся выбары ў УРАД КЛЕЦКАЙ гміны. Кандыдатаў на войта ня было, бо ўсе адмовіліся, паклікаючыся на тое, што кепска ўладаюць польскай мовай. Гэткім чынам застаўся выбраны стары войт грамадзянін Барахоўскі.

У заступнікі выбраны са сьпіску Нацыянальнага гр. А. Мікірэй і ў лаўнікі П. Масейчук.

11 ліпня адбыліся выбары ад гміны КЛЕЦКАЙ у СЭЙМІК ПАВЯТОВЫ у НЯСЬВІЖУ. Засталіся выбранымі са сьпіску Нацыянальнага гр. гр. Лявон Краўчук і Ал. Шаўчук, а гэтак сама і ў Рэвізыйную Камісію гр. гр. Д. Рагальчук і Ігн. Дземеннік.

Палітычны агляд.

Зусім няпрыметна і бяз вялікага шуму ўжо доўга цягнецца

конфэрэнцыя ў Жэнэве прадстаўнікоў Амэрыкі, Англіі і Японіі

па пытаньню аб разаружэньні на моры. Францыя і Італія ўхіліліся ад удзелу ў гэтай конфэрэнцыі, выслаўшы толькі сваіх наглядаўнікаў. На гэтай конфэрэнцыі трэба застанавіцца больш падрабязгова дзеля таго, што ад яе вынікаў залежаць як далейшыя ўзаемныя адносіны трох успомняных вялікіх дзяржаваў, гэтак сама і пасьпех з агульным ворагам сучаснай цывілізацыі і агульнага міру — бальшавізмам

Пасьля разгрому Нямеччыны і Аўстра-Вэнгрыі, — у мінуўшай вайне, і выхаду з сям'і вялікіх дзяржаваў Расеі пасьля бальшавіцкай рэвалюцыі, засталіся тры вялікія дзяржавы,—Амэрыка, Англія і Японія, якім стала цесна нават на „Вялікім ці Ціхім“ акіяне. Пасьля ўтраты эўрапэйскімі дзяржавамі многіх сьвятовых рынкаў адзін Далёкі Усход прадстаўляе найвялікшую прыманку для гэтых конкурэнтаў. Дзякуючы гэтаму

асяродак сьвятовага палітычнага цяжару перамясьціўся на Далёкі Усход,

а „Ціхі“ па назову акіян стаў зусім ня гэткім, пагражаючы ў кожную хвілю выбухам ваеннай буры.

У лік складковых элемэнтаў непаразуменьня між трымя наймацнейшымі з ваенна-эканамічнага пункту гледжаньня дзяржавамі, конкурыруючых на Д. Усходзе, уходзяць наступныя: па першае,

Японія у часе вайны трвала засела ў Кітаі.

Гэта было дасягнута з аднаго боку шляхам эканамічнай экспансыі, шляхам памяшчэньня ў Кітайскай прамысл васьці дужых японскіх капіталаў, а з другога боку проста шляхам ваеннай пагрозы ў той час, калі ўсе іншыя дзяржавы заняты былі вайною ў Эўропе. Гэты кірунак палітыкі Японіі дыктуе апрача таго небясьпечнасьць жыцьця на японскіх вастравох, падвергнутых бязупынным землятрасеньням І вось, калі закончылася сьвятовая вайна, Кітай апынуўся ў моцных лапах японцаў. Гэта падрывала гандлёвыя інтэрэсы Англіі і паважна пагражала англійскім і амэрыканскім калёніям на Д. Усходзе і ў Аўстраліі. Парадзіць гэтаму можна было толькі двумя спасобамі: Ці далейшым вааружэньням і новаю вайною, якая толькі прынясла няшчасьця людзям, ці якой небудзь згодай.

Падгатоўка да вайны патрабуе вялізарных капіталаў. На гэтага здольна толькі Амэрыка. Дзеля гэтага Амэрыка, як маючая найбольш даных для пасьпешнага вядзеньня будучай вайны, узяла на сябе ініцыятыву склікаеньня конфэрэнцыі ў Вашынгтоне ў 1922 г., якая мела мэтаю па першае урэгуляваньне дальне-усходняй праблемы і абмежаваньне далейшых марскіх вааружэньняў, бо між гэтымі дзяржавамі вайна можа быць толькі марская з таго поваду, што яны ня маюць супольных сухапутных граніцаў.

Вашынгтонская конфэрэнцыя,

пастановаў якой ня прызнала ні Францыя, ні Італія, па першае ўрэгулявала ўзаемныя адносіны вялікіх дзяржаваў на Д. Усходзе, асабліва ў Кітаі, і па другое — ўстанавіла прынцып далейшых марскіх вааружэньняў. Быў абмяжованы лік вялікіх марскіх ваенных караблёў, іх разьмер і ўзаемныя саадносіны І ў той час, калі перад вайною Англія буд вала свой флёт па прынцыпу, што ён павінен быць мацнейшы двух найвялікшых разам узятых флётаў, на Вашынгтонскай конфэрэнцыі яна была пастаўлена на адзін ровень з Амэрыкаю. Японія ніжэй Англіі і Амэрыкі. Але на практыцы гэты прынцып ня мог быць захаваны. Амэрыка, як больш багатая знішчыла ўсе ўстарэўшыя крэйсэры і браняносцы і збудавала новыя, больш удасканаляныя, якія маюць большую баявую вартасьць, чым англійскія, выбудаваныя перад вайною, ці ў часе вайны.

Гэткім чынам сарэўнаваньне ў марскіх вааружэньнях Амэрыкі, Англіі і Японіі ня гаворачы аб Францыі і Італіі, зусім не спынілася. Цяпер толькі яно йшло ў другім напрамку —у напрамку ўдасканаленьня буйных баявых адзінак і замены больш старых новымі. У гэтых адносінах Амэрыка і Японія

Доказ „сілы“ і „еднасьці“ віленскіх беларускіх рэдыкалаў.

Камунікат Прэзыдыуму Бел. Нац. Камітэту (№ 1)

„Наша Праўда“ (№ 28) зьмясьціла камунікат Старшыні Бел. Нац. К-ту ў Вільні грам. Ів. Савіцкага наступнага зьместу:

„1-га і 2-га ліпня па розных беларускіх установах былі разасланы паведамленьні аб скліканьні сходу Беларускага Нацыянальнага Камітэту, падпісаныя друмя сябрамі гэтага Камітэту грам. Ярэмічам Ф і грам Стэповічам А. — „за прэзыдыум“. У гэтым паведамленьні вызначаны парадак дня, месца і час сходу. Між іншым, прадбачацца перавыбары прэзыдыум камітэту.

Дзеля таго, што ініцыятыва скліканьня сходу належыць прэзыдыуму, або ініцыятыўнай групе сябраў у паразуменьні з прэзыдыумам Камітэту, а гэтага паразуменьня ня толькі ня было, але ня было навет і папярэджаньня аб скліканьні, прэзыдыўм Камітэту лічыць гэты сход не правамоцным, а пастановы яго, калі такія былі зроблены, незаконнымі.

Прэзыдыум Камітэту апрача гэтага адзначае, што подпісы гр. гр Ярэміча і Стэповіча носяць рысы ПРАСТУПЛЕНЬНЯ, якое пры нармальных варунках караецца, як падлог“.

Агульны сход Бел. Нац. Камітэту у Вільні (№ 2).

„Сялянская Ніва (№ 52) зьмясьціла камунікат аб паседжаньні прадстаўнікоў ад віленскіх беларускіх установаў у Нацыянальны Камітэт, якое адбылося 2 ліпня, наступнага зьместу:

„Справаздачу за мінулы час працы Беларускага Нацыянальнага Камітэту, зрабіў пасол Ярэміч, які ахарактарызаваў час паўстаньня Нацыянальнага Камітэту, мэты і парадак працы, зазначыўшы, што АПОШНІМІ ЧАСАМІ ПРАЦА НАЦЫЯНАЛЬНАГА КАМІТЭТУ, ДЗЯКУЮЧЫ БЯЗДЗЕЙНАСЬЦІ ЯГО ПРЭЗЫДЫУМУ, ЗАМЕРЛА, дык і зьяўляецца заданьнем сёньняшняга сабраньня гэтую працу ажывіць. Вось гэта і пабудзіла некаторых прадстаўнікоў Камітэту склікаць сабраньне.

Сабраньне пастанавіла выбраць прэзыдыум тайным галасаваньнем. У рэзультаце аказаліся выбранымі: на старшыню Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні сэнатар В. Багдановіч і сябрамі пасол Ярэміч і гр. Ц. Каруза.

Сядзібу Беларускага Нацыянальнага Камітэту пастаноўлена перанясьці з Віленскай 12—6 на Людвісарскую 1—19.“

Адказ „Львам“.

„Сял. Ніва“ (№ 53) прабуе тлумачыцца перад закідамі „Бел. Слова“, што яна нічагусенькі не зрабіла падчас выбараў у гмінныя рады. Прычым „Сял. Ніва“ радзіць нам зьвярнуцца да ўсіх яе нумараў, пачынаючы з 44 да апошняга.

„Сяльніва“ вельмі хітра ломіцца ў адчыняныя дзьверы. Алеж-жмы ані словам не спамянулі аб тым, што яна зусім нічога не пісала аб выбарах. Мы толькі сказалі і яшчэ раз паўтараем, што „Сель-Саюз“: 1) ня выпусьціў аніводнай адозвы для беларускай вёскі ў справе выбараў; 2) не выдрукававаў закона аб выбарах да гмінных радаў; 3) не выдрукаваў ані воднага экзэмпляру закону аб валасных самаўрадах; 4) не паслаў аніводнага інструктара на вёску; 5) не зарганізаваў цэнтральнага выбарчага апарату, хаця і крычэў аб тым, што быццам зрабіў гэта; 6) не зарганізаваў на вёсках і мястэчках лёкальных выбарчых апаратаў; 7) не прыняў ніякага актыўнага ўдзелу ў выбарах гмінных радаў; 8) не выдрукаваў у сваей газэтцы аніводнага справазданьня аб выніках валасных выбараў (бо іх ня меў), за выняткам Рагуляўскай Любчанскай гміны, якую нават правідлова напісаць не маглі („ЛУБЧАНСКАЯ).

Што датычыць таго, што „Сяль-Ніва“ хваліцца, што яна пісала на сваіх шпальтах аб выбарах, пачынаючы ад № 44, дык дзіўным было-бы, каб газэта, якая лічыць сабе беларускаю, нават нічога не напісала-бы аб выбарах. Але дзіўна, што яна гэтае пісаньне ставіць сабе ў заслугу. І зусім дзіўна, што „Сяль-Ніва“ ў нумары ад 29 чэрвеня ўсьцяж кліча сялян ісьці на выбары і дае ўсялякія рады выбаршчыкам, як і каго выбіраць, калі ўсе выбары на Наваградчыне закончыліся 22 чэрвеня, а на Віленшчыне 28 чэрвеня.

Думаем, што гэты наш адказ „Львам“ Сель-Саюза, дзе пададзены толькі голыя праўдзівыя факты, будзе лепшым адказам на ўсю нікчэмнасьць, лаянкі і выкрунтасы збанкрутаваўшыхся ў Вільні і на правінцыі Сельсаюзьнікаў.

нія ішлі ўперадзе Англіі. Толькі пасьля страшнай катастрофы землетрасеньня Японія трохі спынілася. А затым ваaружэньне пайшло яшчэ у адным напрамку.

Вашынгтонская конфэрэнцыя не датычыла зусім будовы меншых тыпаў ваенных караблёў; як мінаносцы, падводныя лодкі і іншыя,

якія гэтак сама маюць вялікае значэньне ў марской вайне. І ў гэтых адносінах распачалося шалёнае сараўнаваньне, прыпамінаючае даваеннае. Зусім зразумела, што ні Англія, ні Японія не маглі пасьпець за Амэрыкаю ў будове дробных марскіх адзінак. І вось, каб спыніць гэта новае сараўнаваньне, якое некарысна адклікаецца на пахістнуўшымся фінансавым палажэньні Англіі і Японіі, зьявілась патрэба скліканьня новай марской конфэрэнцыі, на гэты раз у Жэнэве, хаця ізноў ініцыятыва выйшла ад Амэрыкі.

Паседжаньня жэнэўскай конфэрэнцыі адбываліся большаю часткаю закрыта, дзеля гэтага невядома, якія пункты выклікалі найбольшыя непаразуменьня. Вядома толькі, што

конфэрэнцыя перажывала вельмі крытычныя хвілі

і некалькі разоў зьяўлялася небясьпека зрыву перагавораў. У часе перагавораў уяўнілася, што Японія больш трымае бок Англіі. Гэта вельмі паважнае значэньне мае з пункту гледжаньня англійска-японскіх узаемаадносінаў у Кітаі і стварэньня агульнага антырадавага фронту на Д. Усходзе. Што датычыцца урэгуляваньня аснаўнога пытаньня аб будове баявых адзінак, не абхопляных вашынгтонскаю конфэнцыяю, дык да апошняга момэнту яшчэ не дасягнута поўнай згоды. Але трэба надзеяцца, што будуць захаваны саатнашэньня, устаноўляные на Вашынгтонскай конфэрэнцыі, гэта значыць: 5—3—1,75 (першая лічба для Амэрыкі і Англіі, другая для Японіі і трэцяя для Францыі і Італіі. А самае важнае, што будуць наладжаны добрыя адносіны між вялікімі дзяржавамі, ад чаго залежыць агульна — сьвятовы мір.

У зьвязку з гатай конфэрэнцыяй, маючай сваею мэтаю ўстраніць усе спрэчкі між трымя найвялікшымі дзяржавамі, стоячымі на стражы агульнага міру, паўстае

пытаньне аб магчымасьці выбуху вайны між Радавай Расеяй і Англіяй,

аб якой бязупынна крычаць бальшавіцкія правадыры. Гэтым пытаньнем займаецца на шпальтах нямецкай газэты „Deutsche Allgemeine Zeitung“ адзін з нямецкіх паважных ваенных спэцыялістаў гэн. Фрэнкэнбэрг. Пасьля падрабязгавага разважаньня ён прыходзіць да выніку, што гэта вайна зусім магчыма і што ўсе шансы перамогі на баку Англіі, як стаячай нязьмерна вышэй і ў фінансава-эканамічным і прамыслова ваенным аднашэньні, чым Радавая Расея. Ужо мінуўшая вайна паказала, што ў сучаснай вайне рашучую ролю гуляе тэхніка, у той час як жывая сіла —людзі, на якіх толькі пакладаюць свае надзеі бальшавікі, адходзіць на задні плян, служачы толькі пушачным мясам. Адзіную надзею бальшавікі пакладаюць яшчэ на пасьпех сваёй агітацыі ў часе вайны сярод радоў свайго праціўніка, але гэта надзея гэтак сама бязпадстаўная, як і надзея на сьвятовую рэвалюцыю. Найлепшым доказам гэтага служыць абразцовая дысцыпліна ў экспэдыцыйных атрадах Англіі, Японіі, Амэрыкі і Францыі у Кітаі. Наадварот, вялікую небясьпеку для бальшавікоў прадстаўляе чырвоная армія, трымаючаяся ў пакорнасьці толькі дзякуючы тэрору. Армія царскай Расеі непараўнана стаяла вышэй чырвонай арміі ў дысціплінарным аднашэньні, лепш была снабжэна ваенным матэрыялам, і тым ня меней не магла вытрымаць спробы сілаў з нямецкай, як тэхнічна вышэйшай. За апошні-ж час тэхніка настолькі пайшла ўперад што бальшавікам нават і не сьпяцца тыя сюрпрызы, якія іх могуць спаткаць на кожным кроку ў выпадку вайны з Англіяй, Амэрыкаю ці Японіяй. Гэнэрал Фрэнкэнбэрг даказывае, што Кранштад ня можа тварыць ніякай перашкоды для англійскага ваеннага флёту.

Спадзеўнай ваеннай базаю на выпадак вайны з радавай Расеяй будзе пабярэжжа Балтыцкага мора,

якое падрабязгова ізучаецца англійскім флётам. І цяпер як раз англійскі флёт знаходзіцца ў Балтыцкім моры. Ад Петраграда ўдоўжкі пагранічных дзяржаваў да Менска з любога пункту да Масквы ня больш 600 кілямэтраў, ці некалькі гадзін палёту для аэрапляпаў, якія могуць пралятаць па 6 — 10,000 кілямэтраў бяз супынку, як паказалі вопыты пералётаў праз Атлянтыцны акіян, і некалькі дзён язды для танкаў, якія цяпер гэтак удасканалены, што могуць прахадзіць па любым грунтам. Калі-б нават бальшавікі і ведалі сэкрэт новых тэхнічных удасканаленьняў ў Англійскай ці Амэрыканскай арміі, яны ня ў сілах выкарыстаць іх для сваёй арміі з поваду эканамічнай адсталасьці. Даволі указаць на ваенна-тэхнічныя дасяжэньня амэрыканскай арміі, якая больш міралюбіва настрояна, чым англійская. Паводле апошніх даных у Амэрыцы выпушчаны новыя улітападобныя танкі, якія двіжуцца з скорасьцю 50 кілямэтраў у гадзіну, г. зн. скарэй, чым бальшавіцкія цягнікі па жалезным дарогам. Пушкі проціў аэрапляпаў выпускаюць 27 прыцэльных снаранаў у мінуту на вышыню 25,000 футаў. Аэрапляны падымаючыя бомбы з узрыўчатым матэрыялам весам у адну тону (61 пуд). Аўтаматычныя ружжы, выпушчаючыя 120 3-х фунтовых пуль у мінуту на 3 кілямэтры. 6-ці дзюймовыя палявыя пушкі, перадвігаючыяся па трактарах, з скорасьцю 15 англійскіх міляў ў гадзіну. 9,5 дзюймовыя гаўбіцы на гэткіх жа самых трактарах. Проці - арэпляпавыя пулямёты, выпускаючыя па 2,000 пуль у мінуту. 14 ці дзюймовыя арудзія, выпускаючыя снарад вагой у 42 пуда — на англ. 25 міль, 16-ці дзюймовыя арудзія, кідаючыя снарады большыя, чым у адну тону, на 35 англійскіх міль, прычым на любой дыстанцыі гэты снарад прабівае стальёвую броню, таўшчынёю ў 14 дзюймаў...

Калі ў мінуўшую вайну Немцы выдумалі пушку, з якой абстрэлівалі Парыж на дыстанцыі 90 кілямэтраў, дык у будучай вайне, адзін бальшавіцкі аглядчык прадбачыць паяўленьне гэтакіх пушак, якія будуць страляць на 180—200 кілямэтраў, ці змогуць страляць праз усю тэрыторыю гэткіх дзяржаваў, як Літва, Латвія, Эстонія, Бэльгія і інш. І гэта цяпер зусім не фантазія. А колькі маецца рожных адкрыцьцяў ў вобласьці ядавітых газаў, якія трымаюцца ў строгай тайне.

І пасьля ўсяго гэтага чырвоныя дыктатары пужаюць яшчэ буржуазную Эўропу ці Амэрыку баявой гатоўнасьцю сваей чырвонай арміі, якая быццам у любы мамэнт гатова выступіць на абарону „сацыялістычнай бацькаўшчыны“, якая апынулася ў небясьпецы.

N.

Пашырайце роднае слова!

Водгукі працэсу Барыса Кавэрды

Як паведамляюць газэты, працэс Барыса Кавэрды ускалыхнуў у Парыжу ўсе грамадзянскія кругі. Перш-на-перш адклікнулася расейская эмігрантская адвакатура. На днях было склікана па ініцыятыве расейскіх адвакатаў паседжаньне па поваду працэса Б. Кавэрды, на якім быў цвет расейскай і францускай адвакатуры грамадзянства. Усе аратары прызналі ўсю павагу таго, што зрабіў Б. Кавэрда.

В. Насовіч лічыць, што выстрал Кавэрды учынак Кавэрды... Гэта Давід, выступіўшы на едзінаборстба з Галіяфам. І Галіяф паў ад рукі хлапца. Блага заўсёды гіне перад сілаю духа.

Гаварыў яшчэ цэлы рад аратараў. Гаварылі шчыра, пераконана Закрываючы паседжаньне Насовіч заявіў; „Канрадзі і Палуніка судзілі Швэйцарскія прысяжныя засядацелі і сваім асудам асудзілі камунізм. Кавэрду судзіў увесь цывілізаваны сьвет і выняс яму апраўдацельны прыгавар. Цяпер руль гісторыі павярнуўся“.

МАНЭЎРЫ АНГЛІЙСАГА ВАЗДУШНАГА ФЛЕТУ



У Лёндане нядаўна адбыліся манэўры ваздушнага флёту, у часе якіх былі паказаны напад і абарона сталіцы, штучныя падзеньня аэрапляпаў, ратаваньне авіятараў з падаючых апаратаў пры помачы парашутаў 1 г. д

зрабіў пералом у адносінах эўрапэйскіх народаў і ўрадаў да радавай улады.

Ю. Сяменаў падкрэсьліў, што ў пэўных гістарычных абставінах, у часе слабасьці дзяржаўнай улады нават праступленьне перастае быць праступленьнем. Аратар параўнаў прадстаўнікоў камуністычнай улады, якіх радавая ўлада разьмяшчае ў цывілізаваных дзяржавах, з „Траянскім Канём“.

Вядомы абаронца па палітычным справам В. Новікаў даводзіць, што ўсякае палітычнае праступленьне зьяўляецца барацьбою двух сьветаў, барацьбою старай і новай веры. Жыцьцё павінна асьвяшчацца вышэйшымі ідэаламі, інакш яно становіцца істнаваньнем жывёлы. Справа Б. Кавэрды мае вялізарнае гістарычнае і маральнае значэньне.

М. Казарынаў падкрэсьліў агульна-чалавечае зацікаўленьне і значэньне, якія выклікае

* * *

Польскі саюз юрыстаў з акраінаў Польшчы ў Варшаве выдаў на польскай мове брашуру аб працэсе Б. Кавэрды ў палявым Варшаўскім судзе. Брашура садзержыць акт абвінавачаньня, прамовы пракурора Рудніцкага і абаронцаў, адв. Андрэева, Нядзельскага, Пасхальскага і Эттынгера. У хуткім часе з друку выйдзе выданьне брашуры на англійскай і францускай мовах.

АХВЯРЫ ДЛЯ Б. КАВЭРДЫ.

Да рэдакцыі газ. „Русь“ у Сафіі паступіла да 6 ліпня ахвяраў для Б Кавэрды 12,061 лв. Да рэд. „Возрожденіе“ у Парыжу да 10 ліпня — 1547 фр, франкаў.

У Газ. „Наш Путь“, якая выходзіць у Цянзіні (Кітай) адкрыт збор ахвяраў для Б. Кавэрды. У першы дзень паступіла да рэдакцыі 65 даляраў 70 цэнтаў.

Апошнія навіны.

з польшчы.

Бурнае паседжаньне Сойму.

Паседжаньне Сойму 12 ліпня было вельмі бурнае Пасол Путак прачытаў 3 х гадзінную прамову. Нацыянальныя меншасьці учынілі падчас галасаваньня абструкцыю. Дзенная павестка ня была выканана і паседжаньне было адложана да наступнага дня.

ЗАКРЫЦЬЦЕ НАДЗВЫЧАЙНАИ СЭСІІ СОЙМУ і СЭНАТУ.

13 ліпня 1927 г. а 9 г. вечара прыбыў да сойму сэкрэтар Старшыні Рады міністраў паручык Зацьвіліхоўскі і даручыў Маршалку Сойму Ратаю наступнае распараджэньне п Прэзыдэнта:

„На падставе 25 арт. Канстытуцыі замыкаю з сяньняшняга дня надзвычайную сэсію Сойму“. Спала, 13 ліпня 1927 г.

Прэзыдэнт Рэспублікі

(—) *І. Масьціцкі.*

Старшыня Рады Міністраў

(—) *І. Пілсуцкі.*

Гэткім жа чынам зачынена надзвычайная сэсія і сэнату — без вызначэньня тэрміну новай сэсіі.

Адозва расейскіх пісьменнікаў да пісьменнікаў сьвета.

Група расейскіх пісьменнікаў, пражываючая ў Радавай Расеі, выпусьціла адозву да пісьменнікаў сьвета наступнага зьместу:

„Да вас, пісьменнікі, сьвета скіраваны нашы словы.

Чым вытлумачыць, што вы, празарлівыя, пранікаючыя ў глыбіну людзкой душы, душы эпохаў і народаў, праходзіце міма нас, расейцаў, асуджаных грызьць ланцугі страшнай турмы,ваздвігнутай слову?

Чаму вы, узгадованыя на творах гэтак сама і нашых гэніяў слова, маўчыце, калі ў вялікай стране ідзе ўціск вялікай літэратуры ў яе пасьпелых пладах і яе зародышы?

Ці вы не знаеце аб нашай турме для слова — аб камуністычнай цэнзуры ў другую чверць XX в., аб цэнзуры „сацыялістычнай“ дзяржавы. Баімося, што гэта так. Але чаму пісьменнікі наведаўшыя Расею — п. Дзюгамель, Дзюртэн і інш. — чаму яны, вярнуўшыся дамоў, нічога не саабшчылі аб гэтым? Ці іх ня цікавіць палажэньне друку ў Расеі? Ці яны глядзелі і не бачылі, бачылі і не зразумелі? Нам болесна ад думкі, што звон казённых бакалаў з казённым шампанскім, якім частавалі ў Расеі інастранных пісьменнікаў, заглушыў лязг ланцугоў, надзетых нашаму літэратуру і ўвесь расейскі народ.

Паслухайце, даведайцеся!

Ідэалізм, вялізарная цеча расейскай мастацкай літэратуры лічыцца дзяржаўным праступлеўньем. Сучасныя пісьменнікі, западозраныя ў ідэалізме, лішаны ня толькі магчымасьці, але і ўсякай надзеі на магчымасьць выдаць свае творы. Самі яны, як ворагі і разрушыцелі грамадзкага строя, выганяюцца са службы і лішаюцца усякага зарабку.

Гэта першая сьцяна турмы, за якою пасаджана вольнае слова.

За ею ідзе другая сьцяна. Усякая рукапісь, ідучая ў друкарню, павінна быць прадварыцельна прадстаўляна ў двух экзэмплярах да цэнзуры. Акончальна выдрукованая, яна ідзе туды зноў — для другой праверкі. Бывалі выпадкі, калі асобныя выразы, адно слова і адна літэра ў слове (заглаўная літэра ў слове „Бог“), прапушчаная цэнзарам, аўтарам, выдаўцам ці карэктарам, прывадзілі пры другой цэнзуры да бязлітаснай канфіскацыі Ухвале цэнзуры падляжаць усе творы — нават хіміі, астраноміі, матэматыкі. Бяз згоды цэнзуры ня можна выдрукаваць нават візітнай картачкі.

Паны Дзюгамель і Дзюртэн маглі лёгка заўважыць, што нават тэатральныя плакаты з надпісамі „ня курыць“, „запасны выхад“ памечаны візаю ўсе гэтай сакрамэнтальнай цэнзуры.

Есьць яшчэ і трэцяя сьцяна, трэцяя лінія дроцяных загародак і воўчых ямаў. Для паяўленьня ўсякага выданьня патрэбны спэцыяльны дазвол улады, які нават вучоным не даецца больш, як на два гады. Да друку прыймаецца толькі тое, што па душы камуністычнай цэнзуры. Усе іншае, нават талантлівае, ня толькі ня можа быць выдрукавана, але павінна хавацца, бо найдзенае пры вобыску пагражае арыштам, ссылкаю і растрэлам. Адзін з лепшых прававедаў Расеі — праф. Лазарэўскі — быў растрэляны за то, толькі, што ў яго быў знойдзены праэкт расейскай конституцыі.

Ці ведаеце вы ўсё гэта? А калі ведаеце, чаму маўчыце? Ваш громкі пратэст проці казьні Сакко, Ванцэці мы чулі, а прасьледаваньне аж да казьні лепшых расейскіх людзей, нават не агітуючых сваіх ідэй, за поўнаю немагчымасьцю прапаганды, праходзяць міма вас.

Пісьменнікі! Вуха, вока і сумленьне сьвета — адклікнецеся! Не вам пацьверждаць: „німа ўлады, якая не ад Бога“. Вы не скажаце нам жорсткіх слоў: „усякі народ упраўляецца дастойнаю яго ўладаю“.

Успомніце гады перад рэвалюцыяй, калі нашы грамадзянскія арганізацыі, органы мейсцовых самаўрадаў, Гасударственая Дума і нават паасобныя міністры клікалі, прасілі, умалялі ўладу зьвярнуць з шляху, вядучага да процьмы. Улада засталася глуха і нема. Прыпомніце, каму вы тады спачувалі — кучцы навокала Распуціна ці народу? Каго вы тады асуджалі і каго маральна падтрымлівалі?

Дзе-ж вы цяпер?

Мы ведаем: апрача спачуцьця, апрача маральнага асуда самай акрутнай з дэспотыяў вы ня можаце памагчы ні нам, ні нашаму народу. Большага, аднак, мы і не чакаем. З тым большым натугам мы чакаем ад вас магчымага!

З энэргіяй усюды і заўсёды зрывайце перад грамадзкай сьвядомасьцю сьвета штучную ліцамерную маску з таго страшнага твару, які прадстаўляе камуністычная ўлада ў Расеі. Мы самі бязсільны зрабіць гэта: адзінае наша аружжа — пяро — выбіта з нашых рук, паветра, якім мы дышам — літэратура—адабраны ад нас, мы самі—у турме.

Ваш голас патрэбны ня толькі нам у Расеі. Падумайце і аб саміх сабе: з дзьявальскаю энэргіяй, у ўсей сваей вялічыне відзімай толькі нам, вашы народы штырхаюцца на той-жа шлях ужаса і крыві, на які 10 гадоў назад быў штурхануты наш народ, зморaны вайною і палітыкаю дарэвалюцыйнай ўлады. Мы пазналі гэты шлях на Галгофу народаў і перасьцярагаем вас аб ім.

Як з турмы падполья высылаем мы гэта пісьмо. З вялікаю рызыкаю пішам яго, з рызыкаю для жыцьця яго пераправяць заграніцу.

Ня ведаем, ці дасягне яно шпальтаў вольнага друку. Але калі дасягне, калі ваш замагільны голас зазвучыць сярод вас, заклінаем вас:

Услухайцеся, учытайцеся, удумайцеся.

Норма павядзеньня нашага вялікага пакойніка Л. Н. Тоўстога, — крыкнуўшага ў свой час на ўвесь сьвет — „не магу маўчаць“, стане тады і вашаю нормаю.

Група расейскіх пісьменнікаў

Расея, травень, 1927 г.

Паводле апошніх вестак гэта пісьмо, выдрукаванае ў многіх заграніччных газэтах, выклікала масавыя арышты у Расеі і шуканьне, хто пранёс яго праз граніцу. Удоўжкі ўсей польскай граніцы агэнты Г. П. У. шукаюць сьлядоў гэтай кантрабанды.

Раунапрау'е мовау у Радавай Украіне.

Радавае тэл. агенства паведамляе аб тым, што украінскі ўрад аб'явіў аб раўнапраў'і моваў усіх пражываючых у краю нацыянальнасьцяў. Кожны грамадзянін мае права з дзяржаўнымі інстытуцыямі карыстацца роднай мовай, прычым дзяржаўныя органы павінны па жаданьню кожнага грамадзяніна вясьці снашэньня з ім на яго роднай мове. Усім грамадзянам прадастаўляна права карыстацца роднай мовай на ўсіх публічных выступленьнях і ў грамадзкім жыцьці.

Дзеля таго, што на Ўкраіне перавышае украінская нацыянальнасьць, аснаўной мовай для афіцыяльных снышэньняў выбрана украінская. Усе дэкрэты, распараджэньня Ц.В.К. саўнаркома, цэнтральных інстытуцыяў Радавай Украіны, акружных іспалкомаў і г радзкіх радаў павінны публікавацца на украінскай і апрача гэтага на расейскай мовах. Паважнейшыя дзяржаўныя акты павінны асобна публікавацца яшчэ на мовах нацыянальных меншасьцяў.

Суд павінен вясьціся на украінскай мове. Дзеля забесьпечаньня інтарэсаў нацыянальных меншасьцяў, складаючых кампактныя масы ў якой небудзь мейсцовасьці, павінны быць зарганізаваны асобныя нацыянальныя судзебныя камеры. Калі стораны, сьвядкі, экспэрты, абвінавачаны не валадаюць мовай, на якой вядзецца судовая расправа, суд павінен запрасіць тлумача.

Сетка асьвятовых інстытуцыяў павінна будавацца гэтак, каб насяленьня кожнай нацыянальнасьці мела магчымасьць адтрымаць пачатковую прасьвету на роднай мове. У усіх школах і дзяцінных дамах абавязковым прадметам павінна быць украінская мова. У фабрычных школах і работніцкіх курсах абучэньне павінна вясьціся на роднай мове вучня.

Распараджэньне садзержыць у сабе также сродкі садзейства разьвіцьцю украінскай культуры. Уся праца па кіраўніцтву украінізацыяй даручаецца ўсеукраінскай цэнтральнай камісіі, на чале якой стаіць старшыня саўнаркома а практычнае кіраўніцтва на мейсцах—акружным камісіям па украінізацыі пры акружных іспалкомах.

Старшыня украінскай дырэкторыі у Парыжу Лявіцкі заявіў па гэтаму поваду кар. „Матэна“, што гэта азначае хуткі канец бальшавізму. І было бы нялепа—закончыў ён, — каб не падрыхтавацца да таго момэнту, калі згіне бальшавізм.

З ь е м!..

У апошнія дні бальшавіцкія правадыры шмат крычаць аб ваеннай небясьпецы і пераможнасьці С. С. Р. Р.

— Хаця зубоў ня маю, але ў мяне доўгі язык...

(„Сегодня“).

Як быу распушчаны Сэнат.

13 ліпня ў 5 ч. 30 м. было адчынена паседжаньне Сэнату. На канцы дзеннай павесткі стаяло пытаньне аб зьмене констытуцыі, прынятай соймам, і даючай права самароспуску. Калі быў праверaны лік прысутных сэнатараў на салі, маршак Трамчынскі даў голас дакладчыку сэнатару Тулі. У гэты час з дзяржаўнай лавы падняўся міністар унутраных справаў Складкоўскі і папрасіў слова. Гэн. Складкоўскі ўзайшоў на трыбуну і прачытаў пастанову, падпісаную Прэзыдэнтам Рэспублікі і марш. Пілсуцкім аб роспуску надзвычайнай сэсіі Сэнату. З поваду гэтага факту маршалак абвесьціў закрыццe сэсіі Сэнату. Роспуск сэсіі Сэнату, мінаваўшы Сойм, зьяўляецца выразам апініі ураду, які лічыць, што зьмена Констытуцыі ў напрамку надзяленьня палатаў правам самароспуску на падставе ўласнай пастановы не падыктована паглядамі, маючымі на мэце аздараўленьне дзяржаўнага строю, але мае характар антыўрадавай дэманстрацыі.

ПАДПІСАНЬНЕ ДЭКРЭТУ АБ ПАЗЫЫЦ.

Прэзыдэнт Рэспублікі падпісаў дэкрэт аб каротка-тэрміновай пазыцы.

ПАСЛАННІК ПАТЭК У МАРШ. ПІЛСУДСКАГА.

Польскі пасланнік у Маскве Патэк быў прыняты маршалкам Пілсудзкім у Бэльвэдэры і меў з ім поўтарагадзінную конфэрэнцыю.

З ЗАГРАНІЦЫ.

ПЕРАРЫУ КОНФЭРЭНЦЫІ У ЖЭНЭВЕ.

Сэкрэтар конфэрэнцыі 3 дзяржаваў апублікаваў камунікат аб тым, што з поваду трагічнай сьмерці ірландзкага міністра юстыцыі О' Гігінса, бышага дэлегата на конфэрэнцыі па пытаньню аб абмежаваньні марскіх ваарyжэньняў, наступнае паседжаньне адложана на неакрэсьлены час.

Замардаваньне Ірландскага міністра.

У часе язды міністра юстыцыі Ірландыі Гігінса на аўтамабілі, тры незнаёмыя асобы выстрэлілі ў яго тры разы з рэвальвэру. Адна куля трапіла ў галаву. Міністар скора памёр. Страляўшыя яшчэ ня схопляны.

ХВАРОБА „СТАРАГА ТЫГРА“.

Стан здароўя Клемансо, які з поваду агульнай слабасьці не пакідае ложка ужо трэці тыдзень, значна пагоршылася. Міністар Лушэр паведаміў палату дэпутатаў, што Клемансо борацца са сьмерцью.

ХВАРОБА ВЯЛ. КН. МІКАЛАЯ МІКАЛАЕВІЧА.

Вялікі кн. Мікалай Мікалаевіч паважна захварэў у Францыі.

СЬМЕРЦЬ ГЭН. ГОФМАНА.

У Нямеччыне памёр гэн. Гофман, які адыграў паважную ролю пры нямецкіх ваенных апэрацыях на ўсходнім фронце і Брэст-Літоўскага міра з бальшавікамі. Пры перагаворах з Троцкім у Бр-Літоўску ён стукнуў кулаком па сталу і сказаў: „я не пазволю агітаваць праз вакно!“ І бальшавікі павінны былі падпісаць дагавор Затым гэн. Гофман увесь час насіўся з плянам ваеннай экспэдыцыі да Масквы. У асобе гэн. Гофмана Эйропа лішылася найбольшага ворага маскоўскіх бальшавікоў ня гледзячы на тое, што нямецкія нацыяналісты фліртуюць з ім“.

СТЫХІИНАЯ КАТАСТРОФА У НЯМЕЧЧЫНЕ.

8 ліпня у Саксоніі абарвалася хмара, выклікаўшая навадненьня. На другі дзень паўтарылася ў гэтых самых мейсцах бура. Некалькі гарадоў і вёсак зусім былі заліты вадою. Шмат дамоў разрушака. жалезныя дарогі пашкоджаны. Страты дасягаюць 70 мільёнаў мар. Жалезныя дарогі будуць папраўляны толькі праз паўгода. Усе жал.-дарожныя масты зьнішчаны. Каля 200 асобаў забіта і аб 50 німа ніякіх вестак

ЯК ГІНУЦЬ ГЕРОІ.

У суббоцу ўтануў у часе купаньня бышы нямецкі адмірал Кох, герой марской бітвы пад Скагэракам нямецкага і англійскага флётаў у часе вялікай вайны

ЗЕМЛЯТРАСЕНЬНЕ ў ЕРУСАЛІМЕ.

У Ерусаліме мела мейсца землятрасеньне. Шмат дамоў разбурана, лічба ахвяраў у людзях значная. Матэр'яльныя страты гэтак сама значныя.

Ерусаліму пагражае руіна.

У раёне Ерусаліма пасьля землятрасеньня пануе паніка. Многім царквам і мячэцям пагражае небясьпека развалу. Царкоўныя службы адбываюцца пад адкрытым небам. Лічба ахвяраў дасягае 540 асобаў.

Будучая вайна.

Французскі маршалак Фош заявіў, што ў будучай вайне, якая выбухне у працягу 15 — 20 г., прымуць удзел ўсе амаль дзяржавы Эўропы. Бароцца будуць ня толькі мужчыны, але кабеты і дзеці. Барацьба будзе вясьціся на сушы, моры і ў паветры.

На выпадак вайны.

Маскоўскія газэты друкуюць тэлеграму свайго кор. з Бэрліна ад 9 ліпня наступнага зьместу: па атрыманым там праўдзівым інфармацыям, да Коўны прыехаў 30 чэрвеня англійскі маёр Нэсбіт, зьяўляючыся заступнікам кіраўніка англійскай разьведкі. Ен мае паручэньне аб'ехаць ўсе дзяржавы Прыбалтыкі і Польшчу з мэтаю выясьненьня баяспасобнасьці іх арміі і магчымасьць аказаць актыўнае падтрыманьне Англіі на выпадак будучай вайны Англіі з С. С. Р. Р. У Коўне Нэсбіт пасяціў Вальдэмарэса і начальніка гэнэральнага штаба. Ен абмеркаваў пытаньне аб снабжэньні Літвы англійскай артылерыяй і амуніцыяй, а так сама аснаваньня базы для англійскага вадушнага флёта.

РАЗРЫУ РАДАВА-ЯПОНСКІХ ПЕРАГАВОРАУ.

Радава-японскія перагаворы аб заключэньні гарантыйнага дагавору зусім праваліліся. Японскі прадстаўнік Танакі з поваду нэгатыўных вынікаў перагавораў з Літвінавым, потым выехаў з Масквы ў Токіо для дакладу свайму ўраду.

ПЭКІН ПЕРАД ПАДЗЕНЬНЕМ.

Пачалася эвакуацыя Пэкіна. Згуба апошняй абароннай лініі р Гван-Ха творыць пагрозу заняцьця сталіцы паўднёвымі вайскамі Шэка з дня на дзень. Сытуацыя паўночных войск пагаршаецца з поваду перахода часьцей на бок праціўніка

ЦЯЖКІЯ ХВІЛІ ДЛЯ КОМУНІСТАУ.

У Гавані амэрыканцы арыштавалі 87 камуністаў.

Рэкорд за рэкордам.

У Рыо-де Жанэйра (Бразылія ў паўднёвай Амэрыцы) прыбыў з Гэнуі грэчэскі лётнік Барос, які праляцеў найбольшы прастор — 10,000 кілямэтраў, — бяз спуску, пабіўшы гэтым самым усе папярэднія рэкорды пералёту над акіянам.

У ЧЫРВОНЫМ ПЕКЛЕ.

Работа катау.

Паводле даных, паступіўшых у цэнтральнае Г. П. У. у Маскве ад мейсцовых чэка у першую трэць 1927 г. у С.С.Р.Р. растрэляна 750 чалавек. За другую трэць года лік ахвяраў чырвонага тэрора будзе значна больш дзеля таго, што Г.П У. з 8 чэрвеня надзеляна надзвычайнымі поўнамоцтвамі казьніць па тром катэгорыям: 1) заложнікаў — для застрашэньня, 2) падазрыцельных — для прэсячэньня і прэдупраждзеньня магчымых „праступленьняў“ і 3) асуджаных рэвалюц. трыбуналам

РАСТРЭЛЫ БЕЗ КАНЦА.

Вырваўшыяся з С.С.Р.Р. асобы паведамляюць аб страшным тэроры, сотнях растрэлаў і масавых арыштах чырвоных афіцэраў.

РАСТРЭЛ ЧЫРВОНААРМЕИЦАУ.

Па прыгавору Маскоўскага ваеннага трыбунала растрэляны камуніст з каманднага складу дывізіёна бранявікоў Грыгор'еў, чырвонаармейцы - камсамольцы Паншын і Шчэрбакоў, як ініцыятары палітычнага выступленьня чырвонаармейцаў дывізіёна. У Казані растрэляна 7 афіцэраў чырвонай арміі. У Маскве растрэлян Бэкендорф за замах на старшыню судзебнага трыбуналу ў Маскве Арлова.

АРЫШТ КАМІТЭТА АНТЫРАДАВАЙ АРГАНІЗАЦЫІ НА УКРАІНЕ.

Паводле заявы сябра Ц. К. украінскай компартыі Грынько ў Кіеве 1 ліпня быў захоплян кіруючы камітэт антыбальшавіцкай арганізацыі, імкнуўшайся да сьвяржэньня комуністычнай улады на Украіне. Да арганізацыі ўходзілі прадстаўнікі ад заможнага сялянства, работнікаў, інтэлігэнцыі і нават чырвонай арміі, вербаваўшыя на мейсцах новых сябраў, якія займаліся шырокаю агітацыяй і мелі некалькі ваарyжонных атрадаў, нападаўшых на паштовыя канторы, жал. дарожныя касы і г. д Пры вобыску знойдзена шырокая перапіска.

126 АПАЗЫЦЫЯНЭРАУ ЗВОЛЬНЯНЫ СА СЛУЖБЫ.

Бюро ўкраінскага камітэту компартыі прадпісала звольніць са службы ў дзяржаўных інстытуцыях 126 партыйцаў. Большасьць звольняных падае на Харкаўскі і Кіеўскі вокругі.

Грабяць награбленае.

У Маскве ў цукравым трэсьце раскрыт рад растратаў. У навучнай часьці цукратрэсту арыштавана 11 служачых за ўзятачніцтва ад прыватных асобаў. Другая група арыштавана за растрату 100,000 руб. Цягнецца да судзебнай адказнасьці больш 40 асобаў.

НЕ ХАПАЕ ТУРМАУ.

З поваду перапаўненьня маскоўскіх турмаў арыштаванымі частка Круціцкіх казармаў вызначана для арыштных памешканьняў і перадана маскоўскаму Г. П. У.

У МЕНСКУ НЕ ХАПАЕ ХЛЕБА.

У зьвязку з апошнімі катастрофамі буры і граду, ў Менску адчуваецца нястача хлеба і мукі. Перад пекарнямі і хлебнымі крамамі стаяць тоўпы. Менскія газэты заклікаюць насяленьне да спакою.

Вока за вока...

Маскоўскі карэспандэнт рыскай газ. „Сегодня" малюе цяперашнюю сытуацыю ў наступных фарбах. Над усею страною навіс чырвоны туман усё растушчана тэрору. Новыя дырэктывы з цэнтра аб „зьнішчэньні" контррэвалюцыянэраў і „шпіёнаў" удахнавілі чэкістаў, якія працуюць без адпачынку. Растрэлы, арышты, высылкі — вось што стаіць на дзенным парадку адміністрацыйнай дзейнасьці. Спэцыялісты па загатоўцы загавораў распяразаліся. Зводзяцца асабістыя мейсцовыя парахункі Турмы перапоўняны. Усе ў страху думаюць аб тым, як бы толькі пераджыць сяньняшні дзень. Прыезд госьця, навет бліжэйшага крэўнага з другога горада — цэлае няшчасьце. Хто яго ведае, гэтага госьця! Усе баяцца адзін другога. Зноў усе гавораць адзін з другім цішком і з агглядкаю. Іностранцаў баяцца, як чумы. Адтрымліваючыя пісьма з заграніцы пасьля кожнага пісьма чакаюць няпрыемнасьці.

Але нараду з гэтым страхам, насупроціў чырвонаму тэрору ідзе хваля адветнага тэрору, хваля, якую падымаюць не паасобныя асабістасьці, а прадстаўнікі масаў, сяляне, работнікі, камсамольцы, якія па бальшавіцкі распраўляюцца са сваімі угнятацелямі. Гэты тэрор „з нізу" ня спыняецца і радавая ўлада, ня здольная справіцца з ім, выказвае сваю „рашучасьць" толькі ў бязсудных парахунках над прыпадковымі заложнікамі з бышых буржуазных клясаў.

БУХАРЫН ПРАДБАЧЫЦ НОВУЮ ВАЙНУ.

Бухарын у дзень 70 угодкаў нямецкай камуністкі Клары Цэткінай праізнёс вялікую прамову, пасьвяшчоную пытаньням вонкавай палітыкі. Бухарын указаў між іншым, што зусім магчыма, што гісторыя цяпер стаіць перад новаю страшнаю барацьбою між радавым і капіталістычным сьветам. Ніякая Эўрапэйская дзяржава на можа вясьці барацьбы, не ўцягнуўшы ў яе сваіх суседзяў.

ТЫДЗЕНЬ АБАРОНЫ ЯК АДКАЗ АНГЛІІ!?

16 ліпня ў Менску пачаўся з вялікім шумам тыдзень абароны, у якім прыймаюць удзел камсамол, піянэры і ваенныя саюзы. Вуліцы упрыгожаны чырвонымі штандарамі, а вокны — плякатамі. Даход вызначаны на т-ва Авіяхім (авіяцыя і атрутныя газы для вайны). У гэты дзень тыдзень лётча газовай абароны распачаўся на тэрыторыі ўсей Усх. Беларусі. Т-ва Авіяхім мае мэтаю прапаганду і падтрыманьне лётнічай і хімічнай прамысловасьці. Усе сябры авіяхіму плацяць кожны месяц па 50 кап. На ўсей тэрыторыі радавай Расеі быццам маецца 30 мільёнаў(?) сябраў авіяхіма.

Непакой рэуваен-савэта.

Рэв. ваенная рада вельмі ўстрывожана весткамі аб ваенных сродках, прыймаемых пэрсыцкім і афганскім ўрадамі, дзеля таго што гэтым нарушаецца радавы плян военных апэрацыяў у напрамку Індыі, выпрацаваны ў зьвязку з абвастрэньням англа радавых адносінаў. Плян гэты прадбачыў незвалочнае распачацьце апэрацыяў па аб'яўленьні вайны. Цяпер выясьнілася, што надзеі на „дружэственны нэйтралітэт" гэтых дзяржаваў прапалі. Пэрсыцкія вайска паявіліся на радавай граніцы, пагражая Закасьпійскай жал. дарозе і тым затрудняя палажэньня радавай арміі, якая павінна сканцэнтравацца ў раёне Кушкі (на граніцы Індыі) Што датычыцца афганцаў, дык яны зусім ня маюць замеру пускаць бальшавікоў на сваю тэрыторыю ў выпадку вайны. Гэткім чынам апэратыўны плян завіс у паветры. Рэўваенсавет, здаецца, мае замер павялічыць лічбу войска ў Сяр.-аз'яцкім ваенным вокругу.

Тутэйшая хроніка

— **ДЗЯРЖАЎНЫЯ ПРАВЫ ДЛЯ БЕЛАРУСКАЙ ГІМНАЗІІ У ВІЛЬНІ.** З наступнага школьнага году беларуская гімназія ў Вільні адтрымае дзяржаўныя правы. У зьвязку з гэтым школьныя ўлады праводзяць рэорганізацыю гімназіі з тым, каб яна адпавядала праграме агульна дзяржаўных сярэдніх школаў.

— **РЭГІСТРАЦЫЯ РОЛЬНЫХ РАБОТНІКАЎ ДЛЯ ФРАНЦЫІ.** 20 ліпня а 9 г. рана ў памешканьні Дзяржаўнага Пасрэдніцтва Працы ў Вільні (вул. Субач № 20-а) будзе праізведзена рэгістрацыя рольных работнікаў для Францыі. Адтрымаюць права на выезд толькі асобы фізычна здаровыя і не старэйшыя 25 г., якія адбылі ваенную павіннасьць. Жадаючыя выехаць будуць падвергнуты агляду спэцыяльнай мэдыцынскай камісіі.

— **КУРСЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ДЛЯ ВУЧЫЦЯЛЁЎ** Куроторыўм школьнага вокруга адкрыў ў Сьвенцянах спэцыяльныя курсы беларускай мовы для вучыцялёў пачатковых школаў. Курсы гэтыя будуць цягнуцца 6 тырняў і мэтаю іх зьяўляецца азнакамленьня вучыцялёў з беларускай мовай, мэтодыкай абучэньня і граматыкаю Гэткія курсы з пачаткам восені будуць адчынены — яшчэ ў Несьвіжы.

ПРЫЗЫУ ЗАПАСНЫХ НА АБУЧЭНЬНЯ.

На аснове распараджэньня ваеннага міністэрства прызываюцца на 4-х тыднёвае абучэньне запасныя з цэлага абшару Рэспублікі катэгорыі „А" наступных гадоў службы: 1902 г. унтэр-афіцэры і радавыя з пяхоты, танкаў і службы сьвязі і 1899 — 1900 г. з выняткам матросаў, якія па якому небудзь поваду не адбылі паложанага абучэньня ў 1925 — 26 г.

Апрача гэтага на падставе ўхвалы рады міністраў ваенны міністар прызывае з цэлага абшару Рэспублікі: 1) на 4 х тыднёвае абучэньне ун.-афіцэраў рэзэрвы ўсіх радоў аружжа 1890, 1891 і 1898 г.г. і радавых рэзэрвы 1901, 1902 і 1903 г.г. 2) на 3-х тыднёвае абучэньне радавых лётніцтва 1896, 1897 і 1898 г.

Рэзрвісты ўказаных катэгорыяў, якія па якім небудзь прычынам не адтрымалі „карт павалаваньня", павінны самі зьявіцца да Р.К.U. у Вільні, адкуль будуць адпраўляны да сваіх ваенных атрадаў. Прызываемыя павінны мець пры сабе ваенную кніжку, мабілізацыйныя карты, як і ўсе ваенныя дакумэнты.

Паводле распараджэньня ваеннага міністэрства прызваныя на ваеннае абучэньне павінны мець з сабою корм на час паездкі да сваіх фармацыяў і ўласныя прыборы для яды (ложку, відэлец, нож).

Рэзэрвістам, прыбываючым цягнікам з гмінаў, распаложаных дальш, як на 25 кілямэтраў ад Р. К. U., кошт падарожны будзе зьвернуты, калі будзе прадстаўляна засьвядчэньня адпаведнага гміннага ўраду (магістрату), паказываючага, што прызваны рэзэрвіста пражываў у гэтай гміне перад адпраўкаю да Р. К. U.

ЖЫЦЬЦЕ ПРОВІНЦЫІ.

СЬПЕКТАКЛЬ У ДЗЯТЛАВЕ.

Драматычны кружок пры Гуртку Т-ва „Прасьветы" у Дзятлаве пав. Наваградзкага 29 ап. траўня наладзіў уласнымі сіламі сьпектакль у памешканьні парафіяльнага дома пад назовам „Дом Людовы". Была пастаўлена п'еса ў 3-х актах Фр. Аляхновіча „Птушка шчасьця". Разыгралі п'есу вельмі добра, ня глядзячы на тое, што артысты ігралі першы раз. Прысутных сабралася шмат. Асабліва добра ігралі: Надзя Чырвоная у ролі Маланкі і Мікалай Белуш у ролі Янкі. У ролі жыда выступаў Лявон Бурдун, а лясного духа — Уладзімір Чырвоны. Кіраваў ігрой вопытны артыста рэжысэр А. Лазоўскі, які палажыў шмат ахвярнай працы на гэтую пастаноўку п'есы. Можна сказаць, што п'еса была лепш разыграна, як іграў яе сам Фр. Аляхновіч у Вільні Калі ігра была скончана публіка, вельмі задаволеная, прасіла артыстаў часьцей арганізовываць сьпектаклі і паставіць другі раз „Птушку шчасьця".

Спектакль закончыўся скокамі. Найбольшую падзяку за арганізаваны сьпектакль трэба зласжыць адказнаму кіраўніку Уладзіміру Гарбуну, які ўтрымаў добры парадак і палажыў шмат працы дзеля пастанаўкі сьпектаклю. Чысты збор пайшоў на карысьць ахронкі ў Дзятлаве.

Драматычны кружок мае на мэце паехаць разам са сваім рэжысэрам у абход па вёсках і мястэчках. Трэба сказаць ім „Божа памажы" на гэтую прасьветную працу.

Птушка.

Пісьмо у рэдакцыю.

(З Гродзеншчыны)

У хуткім часе ў Горадзеншчыне маюць адбыцца выбары да гмінных і гарадзкіх самаўрадаў. Мы, беларусы, сядзім і нічога ў гэтым кірунку ня робім. Гэтыя выбары ёсьць і павінны быць дзеля нас аднэй з найважнейшых нашых справаў, а дзеля гэтага трэба асабліва сур'ёзна аднясьціся да іх і заняцца падгатоўкай выбаршчыкоў. Аб гэткм трэба памятаць цяпер, і рабіць што кольвек, а то мы заўсёды спозьнімся, а пасьля спахватываемся і сьпяшаем.

Рэзультатаў ад гэткай работы ведама мала, бо мы ня усьпяваем ня толькі згуртавацца паміж сабой, але нават і згаварыцца. Дзеля гэтага і робіцца ў нас усё ў разброд.

Ня толькі мы сяляне — сярмяжнікі нічога ня робім дзеля выбароў, але і нашы інтэлігэнты так сама мала дбаюць аб гэтых выбарах і быццам баяцца самі сябе. Яны так сама, як і мы, сярмяжнікі, робяць тое, што далучаюцца да тых партыяў, каторыя шмат чаго абяцаюць, але ў канцы нічога добрага не даюць.

Дзеля таго, каб стаць да выбарных урнаў зусім падгатаванымі і мець выразнае палітычнае аблічча, трэба цяпер-жа, калі і ня актыўна выступіць, дык хоць належна абсудзіць гэтую справу, каб пасьля ведаць, хто для нас лепшы і да каго прыхіляцца, з кім можна дабіцца лепшых рэзультатаў у гэтым кірунку.

Дык будзем-жа прыслухівацца да голасу тых арганізацыяў эканамічных і палітычных, каторыя бліжэй нам па сваім інтэрэсам і праграмам і каторыя зьяўляюцца нашымі прыхільнікамі і гатовы злучыцца з намі, каб разам дабівацца палепшаньня нашага добрабыту.

Горадзянін.

Навука і Тэхніка.

РАДІО і АВІЯЦЫЯ.

Навука і тэхніка гэтак шпарка ідзе ўперад, што няма магчымасьці нават сачыць за ўсімі адкрыцьцямі з гэтай галіны, якія робяцца амаль ні кожны дзень у розных канцох сьвета Што яшчэ год ці два таму назад здавалася недасягаемым, гранічачым з галінай лятуценьняў, тое сяньня ня выклікае ніякага дзіва, зьяўляецца рэальным фактам.

Асабліва вялікія пасьпехі зроблены ў працягу апошніх 2—3 гадоў у галіне радыо і авіацыі ці лётніцтва. Ці мог хто думаць 30—35 гадоў таму назад, калі яшчэ модным былі пар, электрычнасьць і драцяны тэлеграф і тэлефон, што зусім бязпечна можна будзе рушыцца з аднаго мейсца да другога бяз рэльсаў і дарог; што можна размаўляць з аднаго мейсца разам з усім сьветам бяз дроту. Мала гэтага: можна нават бачыць вобраз таго, з кім гаворыш на адлежнасьці якіх небудзь 5—7,000 кілямэтраў. Сядзіш, напрыклад, у вагоне ідучага шпаркім ходам цягніка ў Францыі ці Нямеччыне і слухаеш, як у Нью-Іорку сьпявае Шаляпін, ці прамаўляе да усяго 120 мільённага свайго Народу Амэрыканскі прэзыдэнт Кулідж пры помачы радыо.

Цяпер радіо настолькі удасканалена, што ім карыстаюцца самыя шырокія массы і ў самых разнародных кшталтах. Лёндан можа гаварыць па радіо за ўсею сваей сьвятовай імпэрыяй: Канадаю, Палуднёваю Афрыкай, Індыяй, Аўстраліяй, Новай Зеландзіяй і іншымі. У Бэрліне прадаюцца за пяць марак кішэнёвыя радіо-графічныя апарацікі, якія даюць магчымасьць прынімаць радіограмы з кароткімі хвалямі. Гуляючы, напрыклад, на вуліцы ці скверу Бэрліна з гэтакім апарацікам, можна сесьць на лаўку, выняць з кішані апарат, прылажыць да вуха і слухаць бязплатна канцэрт, ці опэру ў тэатры. Цяпер ня трэба нават іці да тэатру вечарам, каб слухаць канцэрт ці опэру. Можна не адзеваючысь, ляжаць на ложку, адзець на галаву слухаўкі ад прыёмнага радіо-апарату і слухаць бязплатна опэру Бэрлінскага, Лёндонскага ці Маскоўскага тэатраў.

Можна нават фатаграфаваць з Бэрліна ў Вэне па радіо. Ягомась гаворыць са мною, а я яго бачу на асобным шкле, адкуль потым гэты воблік адбіваецца на паперу.

Ці-ж можна пасьля гэтага прадбачыць, якія пасьпехі зробіць навука ў галіне радіографіі ў бліжэйшай будучыне?

Гэтакія-ж самыя цуды робіць і авіяцыя. Ці думалі нашы бацькі, калі былі малымі, што іх дзеці будуць лятаць, як птушкі з меньшаю небясьпекаю, чым езьдзяць на чугунцы?

Цяпер паветраны рух значна бясьпечнейшы, чым вадзяны ці жалезна-дарожны. Уся Нямеччына пакрыта ваздушнымі лініямі ў розных кірунках, якія абслугуюцца сотнямі пасажырскіх аэрапланаў. Есьць аэропляны, якія могуць падняць да 100 пасажыраў з іх грузам. У гэтых лятаючых палацах есьць радіо, рэстараны, спальні і іншыя выгады. За апошні год перавезяна на аэраплянах некалькі сотняў тысячаў пасажыраў і нясчасных выпадкаў было ў сто разоў меньш, чым на чугунцы Гэтак удасканалена авіацыя!

Пасьля сьмелых пералётаў амэрыканскіх авіатараў Ліндбэрга і Чэмбэрлена з Нью-Іорку да Парыжу — 6,000 кілямэтраў у працягу 33 і 29 гадзін — бяз спуску, адкрыліся надзеі новых палёхкаў у галіне камунікацыі Старага Сьвета з Новым. Самы шпаркі параход пераплываў Атлянтыцкі акіян ў працягу 6—7 дзён, калі не перашкаджала бура, а адзін нямецкі інжынер спраэктаваў ужо вялізарны аэраплян, які можа праляцець з некалькімі пасажырамі і грузам гэту адлежнасьць ў працягу 15 гадзін.

Сяньня рана сеў у Бэрліне ці Парыжу, а на другі дзень раніцаю спусьціўся ў Нью-Іорку, як у байцы на „каўры-самалёці"

Францускі інжэнер Блеріо і Амэрыканскі Армстронг апрацавалі пляны стварэньня штучных вастравоў на Атлянтыцкім акіяне Да тэй пары, пакуль яшчэ ня была зроблена першая спраба пералёту цераз Атлянтыцкі акіян Лінбэргам і Чэмбэрленам, і Італьянскім авіатарам Пінэда на гідраплянe, гэтыя пляны стварэньня штучных вастравоў здаваліся міфічнымі і нерэальнымі. Цяпер за іх ухапліся і зусім магчыма, што ў хуткай будучыне Атлянтыцкі і Вялікі акіяны пакрыюцца сеткаю штучных вастравоў у тых кірунках, дзе няма натуральных і у якіх будуць курсаваць Аэрапляны і гідрапляны між Эўропай і Амэрыкай, ці Амэрыкай і Азіяй. Вастравы гэтыя будуць служыць станцыяй для аэрапланаў. Яны будуць засобляны бэнзынаю, варстатамі для папраўкі аэрапланаў на выпадак іх псуцьця, маякамі для арыентоўкі і інш. Гэткім чынам хутка можна будзе пералятаць з Парыжа ці Лёндана да Нью-Іорка у працягу 15 — 20 гадзін з большай бясьпекай, чым цяпер езьдзяць цягнікам на сухапуцьці.

Ш.

Паштовая скрынка.

Раскевічу, гм. Пачараў Калі хочыце атрымаць пробныя нумары нашэй газэты, дык пішыце адрэс выразна і зазначце пошту.

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. І. Баеўскага Вільня, Мастовая 9. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.